калышуцца вішні ў маністах, дзе дубы не згінаюць свой стан, між садоў навагрудскіх квяцістых узнімаецца к небу курган.”

Вобраз кургана – у цэнтры верша як сімвал славы, велічы, памяці людской. Вузкая сцяжына, што вядзе на вяршыню, - гэта і ёсць надзейная, непарушная нітка-сувязь, не падуладная руху часу: “Не заростае сцежка ніколі”.

Беларускія паэты сплялі праўдзівы вянок са светлых, прыгожых вершаў, прысвечаных Адаму Міцкевічу, у якіх жыве вобраз вялікага паэта, у якіх рамантычнымі фарбамі намалявана яго Айчына, спрычыніліся да тварэння той велічнай легенды, што так высока ўздымае імя Адама Міцкевіча.

## АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТВОРАЎ

УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
**Варанец А.В., 4 к., 2 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

Яшчэ задоўга да таго, калі мастацкае слова было зафіксавана ў помніках пісьменнасці, народ выяўляў свае настроі і думы ў песнях, казках, легендах і паданнях, якія былі першымі праявамі яго мастацкай творчасці. Яны на працягу многіх гадоў і стагоддзяў свайго бытавання перадаваліся, станавіліся выдатнымі творамі мастацтва. У іх адлюстроўваліся ўсе найважнейшыя асаблівасці народнага жыцця з самых далёкіх часоў: барацьба чалавека з прыроднай стыхіяй, яго мары, меркаванні, любоў да радзімы і нянавісць да ворагаў, глыбокі аптымізм.

Многія фальклорныя творы ствараліся і бытавалі пры пэўных акалічнасцях – у час свят, працы. Яны суправаджалі працоўную дзейнасць чалавека (працоўныя песні), дапамагалі ў выхаванні дзяцей (песні-калыханкі, дзіцячыя песні, загадкі, казкі), перадавалі новым пакаленням жыццёвы вопыт і мудрасць (легенды, паданні, прымаўкі, прыказкі і інш.). Пашыраючыся і ў пазнейшы час, фальклорныя творы ўплывалі нават на развіцце пісьмовай літаратуры. Вусная паэзія народа заўсёды жывіла паэзію і літаратараў, і пісьменнікаў, была невычэрпнай крыніцай ідэй, вобразаў, спосабаў мастацкага адлюстравання жыцця беларускага народа.

Тэрмін фальклор, які ўзнік у сярэдзіне XIX ст., у перакладзе азначае народная мудрасць. Фальклор у яго вузкім значэнні – адзін з відаў народнага мастацтва, які адлюстроўвае рэчаіснасць у вобразах, створаных пры дапамозе паэтычных слоў.



Репозиторий ГрГМУ

Беларускі фальклор прадстаўлены амаль усімі жанрамі: каляндарная і сямейна-абрадавая паэзія, казкі, паданні і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы, народны тэатр у розных яго відах, сацыяльна-бытавая лірыка. Не было ў беларускім фальклоры такіх твораў, як быльны або думы, спецыфічных для рускага і ўкраінскага фальклору. Але беларускі народ таксама стварыў свой гераічны і гістарычны эпас, які хаця і не набыў адзінай жанравай формы, аднак даволі поўна адлюстроўваў многія гераічныя старанні нашага мінулага.

Падзяліць вусныя народныя творы па часе іх з'яўлення немагчыма, бо ў адным і тым жа творы можна знайсці нешта ад розных часоў, сувязь самой мінуўшчыны з цяперашнім жыццём. Таму лепш разглядаць паасобна віды вуснай народнай творчасці.

Каляндарна-абрадавая паэзія – від фальклору, які суправаджаў аграрныя святы і працу земляроба на працягу гаспадарчага года. Вытокі каляндарна-абрадавай паэзіі – у родавым грамадстве. У самым старажытным пласце каляндарных абрадаў, павер'яў, песень ужо адбіўся культ Сонца. Не выпадкова і найбольшыя земляробчыя ўрачыстасці, святкаванні, у першую чаргу каляды, купалле, прыпадалі на зімовае і летняе сонцастаянне. Паэзія беларускага земляробчага календара ўключае звыш 20-ці жанравых і групавых песенных разнавіднасцей.

Зімовы перыяд у сялянскім каляндары меў падрыхтоўчы характар. Абрады і песні зімовага цыкла былі накіраваны на тое, каб загадзя, наперад паўплываць на будучы ўраджай, захаваць азімыя пасевы, рунь на палях.

Веснавыя абрады і песні павінны былі асвячаць сабою асабліва адказны перыяд у жыцці старажытнага земляроба – пачатак палявых работ, час веснавых усходаў, выгану жывёлы на пашу.

Летнія абрады і песні прызначаліся зберагчы збажыну ў пару даспявання, паспрыяць паспяховаму збору ўраджаю.

Асенні перыяд земляробчага каляндара быў бедны на абрады. Звязаны з уборкай яравых, выбаркай, апрацоўкай ільну, засяваннем азімых – заканчэннем палявых работ, ён характарызаваўся дамінаваннем у песнях перадвясельных матываў, развіццём у іх моцнага лірычнага пачатку.

Замовы (у народзе яшчэ называюць загаворамі, нагаворамі, шэптамі) – гэта славесныя формулы, якім надавалася магічнае значэнне. Замовы – від народнай творчасці, які ў сучасны момант у жывым бытаванні амаль не сустракаецца.

У мінулым замовы былі шырока распаўсюджаны ў быце і мелі чыста ўтылітарнае значынне: з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданае ў рыальнасць, падобным выклікаць падобнае.

Прынята дзяліць замовы на некалькі тыматычных груп:



Рэпазіторый ГрГМУ

1. Замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор ягад, грыбоў, захаванне жывёлы, ураджаю);

2. Замовы супраць хвароб;

3. Замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (сюды адносяцца таксама прысушкі і адсушкі – любоўныя замовы);

4. Замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі і г.д.

5. Замовы каштоўныя тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне асаблівасці гаспадарчага, грамадскага і духоўнага жыцця чалавека. Яны з'яўляюцца помнікамі мастацкага слова народа.

Прыказкі і прымаўкі. У афарыстычнай творчасці беларускага народа прыказкі і прымаўкі карыстаюцца найбольшай папулярнасцю. Яны ярка адлюстроўвалі багаты працоўны і жыццёвы вопыт народа, яго мудрасць, псіхалогію і светапогляд, маральна этнічныя і эстэтычныя ідэалы.

У некаторых з іх адбіліся язычніцкія ўяўленні пра сусвет, прыроду, чалавека, расліны, жывёл. Прыказкі вучаць любіць свой край, Радзіму, яе герояў і ненавідзець ворагаў. Трапна выказвае народ свае думкі пра шчасце, лёс і долю, дабро і зло.

## ВАЕННЫ ПЕРЫЯД У ГІСТОРЫІ ВІЦЕБСКА

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
**Вярхоўская В.А., 1 к., 2 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

23 чэрвеня 1944 года пачалася аперацыя "Баграціён" – рашаючы этап бітвы за Беларусь. Перад наступленнем у адпаведнасці з планам Беларускага штаба партызанскага руху ў ноч на 20 чэрвеня ў тыле ворага на ўсіх чыгуначных магістралях загрымелі выбухі. Пачалася аперацыя "Рэйкавая вайна".

На Віцебскім напрамку раніцай 23 чэрвеня перайшлі ў наступленне войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў. Гэта было нечаканым для нямецкага камандавання. Паспяхова дзейнічалі войскі 39-й і 5-й армій Беларускага фронту. На прцягу 23 чэрвеня яны прарвалі абарону ворага на ўчастку шырынёй 50 км і паглыбіліся на 10-11 км з мэтай акружэння віцебскай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск.

25 чэрвеня войскі 43-й арміі генерала А. П. Белабародава 1-га Прыбалтыйскага фронту і 39-й арміі генерала І. І. Люднікава 3-га Беларускага фронту злучыліся ў раёне в. Гняздзілавічы. Былі акружаны 5 пяхотных



Репозиторий ГрГМУ